*Н.П.ЯКАНЮК*

# МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Формы, змест, мастацкія якасці музычнага мастацтва перыяду Вялікай Айчыннай вайны вызначаліся гістарычнай сітуацыяй.

Музыка прафесійных кампазітараў, выканаўчая дзейнасць і музычная творчасць беларускіх партызын адзначанага перыяду знайшлі адлюстраванне ў работах айчынных музыказнаўцаў (Г.Глушчанка, Т.Дзядзюля, С.Нісневіч, Л.Мухарынская, А.Смагін і інш.). Гэтага нельга сказаць аб карціне музычнага жыцця акупіраваных беларускіх гарадоў і вёсак. Дакументаў таго часу захавалася мала, а ўспаміны сучаснікаў не заўсёды аб’ектыўныя, іншы раз супярэчлівыя. І тым не менш паспрабуем рэканструяваць агульную панараму развіцця музычнага мастацтва краіны ў гэтыя драматычныя гады.

Вядома, што многія прадстаўнікі беларускай музычнай культуры знаходзіліся падчас вайны ў эвакуацыі. Напрыклад, артысты Вялікага тэатра оперы і балета працавалі ў горадзе Горкім, дзе дапамаглі стварыць шэраг пастановак класічнага рэпертуару (у тым ліку оперы “Яўген Анегін”, “Кармен”, балет “Лебядзінае возера”). На горкаўскай сцэне быў пастаўлены і нацыянальны музычны спектакль “У купальскую ноч” (мантаж з урыўкаў оперы Я.Цікоцкага “Міхась Падгорны”, балетаў М.Крошнера “Салавей” і А.Туранкова “Кветка шчасця”) [1].

У ваенныя гады не спынілі гастрольныя выступленні такія калектывы, ужо набыўшыя вядомасць у даваенны час, як Беларускі ансамбль песні і танца, Ансамбль Беларускай ваеннай акругі. Працягвалі канцэртную дзейнасць знакамітыя выканаўцы-салісты: скрыпач А.Бяссмертны, цымбалісты І.Жыновіч, балалаечнік Г.Жыхараў. Паколькі рэпертуар беларускіх музыкантаў складаўся з папулярных твораў рускай і замежнай музычнай класікі, савецкіх кампазітараў, апрацовак беларускіх народных песень і танцаў, узораў музычнага фальклору іншых народаў СССР, іх выступленні карысталіся нязменным поспехам. Сотні канцэртаў далі музыканты Беларусі, выступаючы і ў глыбокім тыле, у Сярэдняй Азіі, Цэнтральнай Сібіры, на Урале, а таксама ў прыфрантавой зоне і вызваленых раёнах — ад Смаленшчыны да Прусіі [2].

Актыўна працавалі і кампазітары рэспублікі. Іх вайна раскідала па шырокіх прасторах Савецкага Саюза. Адной з задач, якую яны вырашалі ў гэтыя гады, было стварэнне музыкі на падставе нацыянальнага фальклору тых рэгіёнаў, дзе ім давялося жыць. Вядомы беларускі кампазітар і фалькларыст М.Чуркін напісаў шэраг твораў на матэрыяле таджыкскіх напеваў, Я.Цікоцкі зрабіў некалькі апрацовак башкірскіх народных песень, М.Шнейдэрман выкарыстоўваў інтанацыі казахскага меласу. Але галоўнай для кампазітараў ўсё ж была ваенна-патрыятычная тэматыка.

Тэмы і вобразы, народжаныя суровай ваеннай рэчаіснасцю, у творчасці беларускіх кампазітараў атрымалі адлюстраванне перш за ўсё ў песенных і харавых творах. Пазней з’явіліся і творы іншых жанраў: опера Я.Цікоцкага “Алеся”, сімфанічная паэма “З дзённіка партызана”, сімфанічная балада “У суровыя дні” і Другі струнны квартэт М.Аладава, а таксама фартэпіяннае трыо А.Багатырова, Канцэрт для скрыпкі з аркестрам П.Падкавырава. У гэтыя ж гады А.Багатыровым былі створаны кантаты “Беларускім партызанам” і “Ленінградцы”, якія ўвайшлі ў залаты фонд беларускай музычнай класікі.

Не спынілася музычнае жыццё і на акупіраванай тэрыторыі. Як і да вайны, роля музычнага мастацтва была вельмі значная. Нягледзячы на ўсе цяжкасці ваеннага ліхалецця, працягвалася звычайнае чалавечае жыццё. Людзі працавалі і адпачывалі, ладзілі вяселлі і нараджалі дзяцей, збіраліся на сямейныя святы і проста сумесна праводзілі вольны час. А калі была падстава для радасці, то, як і ў мірны час, гучалі музычныя інструменты, спяваліся песні.

Вельмі папулярнымі былі народныя музычныя інструменты гармонь, баян, мандаліна, балалайка. Да іх, згодна ўспамінам сучаснікаў, жыхары беларускіх гарадкоў і вёсак звярталіся нават часцей, чым у даваенныя гады.

У акупіраванай зоне заставалася нямала прафесійных музыкантаў. Новая ўлада не забараняла работу мастацкіх калектываў. У Мінску пачалі сваю дзейнасць гарадскі тэатр, пры якім існавалі оперная і балетная трупы, невялічкі па колькасці ўдзельнікаў ансамбль беларускіх народных інструментаў, а таксама сімфанічны аркестр, які па дамоўленасці з арганізатарамі Мінскага падполля ўзначаліў беларускі кампазітар і піяніст М.Клаус. Сярод музыкантаў аркестра было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нямала яўрэяў, якіх работа ў тэатры дазволіла вызваліць ад гета. Некаторыя ўдзельнікі аркестраў, як, напрыклад, Д.Жураўлёў, падтрымлівалі сувязь з Мінскім гарадскім падпольным камітэтам, дзякуючы чаму дапамаглі пазбегнуць арышту многім мінчанам і пераправіць некаторых музыкантаў у лес да партызан.

Працягвалі сваю прафесійную дзейнасць музыканты-выканаўцы. Кампазітарамі, сярод якіх былі такія вядомыя да вайны аўтары, як М.Куліковіч-Шчаглоў, М.Равенскі, А.Туранкоў, стваралася музыка, што абапіралася на нацыянальныя карані. Музыканты сцвярджалі мастацкую значнасць і высокую каштоўнасць беларускай народнай і акадэмічнай музычнай культуры. Як адзначаў пазней М.Клаус: ”Я, чым мог, падтрымліваў у людзях веру ў тое, што наша беларуская культура — непераможная, высокадухоўная... Нямецкія салдаты, вяртаючыся пасля спектакляў у казармы, у захапленні гаварылі:”О, нават у Германіі мала такіх тэатраў, а тут, у разбураным горадзе, — і Моцарт, і Бетховен!” [3].

Своеасаблівым кірункам развіцця музычнай культуры Беларусі ў ваенныя гады была творчая дзейнасць музыкантаў у партызанскіх атрадах. Сярод беларускіх партызан было нямала як музыкантаў–аматараў, так і тых, хто меў прафесійную музычную адукацыю. Музыка была жыццёвай неабходнасцю для людзей, якія на працягу некалькіх гадоў былі абмежаваны ў зносінах, нават у перамяшчэнні. Музыка дапамагала пераносіць цяжкасці і боль чалавечых страт, жыццёвыя нягоды і няшчасці.

Мы ўжо адзначалі, што ў мастацкім жыцці шырока выкарыстоўваліся народныя музычныя інструменты. Паколькі далёка не ў кожным атрадзе быў музыкант, які валодаў баянам ці гармонікам, часам прыходзілася “перакваліфікавацца” былым піяністам або скрыпачам. Музыкант быў адной з цэнтральных фігур штодзённага партызанскага быту. Ветэраны ўспамінаюць і сёння, як у дні дзяржаўных свят той ці іншы атрад адбіваў у немцаў бліжэйшую вёску, дзе партызаны ладзілі ўрачысты мітынг і невялічкі святочны канцэрт для жыхароў. Часам музыкантаў-партызан запрашалі іграць нават на вяселлі. Платай за гэта былі не толькі прадукты, якія дапамагалі партызанам перажыць цяжкія гадзіны, але і слёзы радасці на вачах слухачоў.

Як адзначала даследчыца песеннай творчасці беларускіх партызан Л.Мухарынская, музыка была важным звяном штодзённага жыцця. У лістападзе 1942 г. сфарміравалася мастацкая брыгада партызанскіх аб’яднанняў Мінскай вобласці, у склад якой уваходзілі шмат цудоўных музыкантаў, спевакоў і акцёраў. Інструментальным ансамблем гэтай брыгады кіраваў С.Маркоўскі — выпускнік Пецярбургскай кансерваторыі па класу ўдарных інструментаў, да вайны — выкладчык Беларускай кансерваторыі па класу цымбалаў, настаўнік знакамітага цымбаліста І.Жыновіча.

У 1943 г. з удзельнікаў партызанскай самадзейнасці сталі фарміравацца асобныя мастацкія атрады і агітбрыгады. Так, на Віцебшчыне была добра вядома агітбрыгада А.Данукалава, у Лідскім раёне — партызанскі ансамбль пад кіраўніцтвам А.Ананьевай і П.Драгуна, у Клічаўскім раёне дзейнічаў ансамбль “бярозаўцаў” пад кіраўніцтвам М.Быкадорава. У Вілейскім раёне актыўна працаваў агітатрад імя М.Горкага, якім кіраваў скрыпач і дырыжор А.Нікалаеў (з ім звязана шмат старонак пасляваеннай народна-інструментальнай культуры Беларусі) [4].

Сярод удзельнікаў пералічаных ансамбляў былі выдатныя музыканты, многія з якіх валодалі народнымі інструментамі. У гісторыю беларускай музычнай культуры назаўсёды ўвайшлі імёны таленавітага баяніста-імправізатара М.Быкадорава, адданага музычнаму мастацтву баяніста, балалаечніка і гітарыста А.Вешава, бліскучага скрыпача-імправізатара І.Гусінцава, гітарыста К.Гаўрылава, балалаечніка М.Фядуліна, баяніста М.Захарава і інш.

У агітатрадах сустракаліся патомныя музыканты фальклорнай традыцыі. Так, у адным з атрадаў з поспехам выступала сямейнае трыо Шакуравых — браты Яўген, Леанід і сястра Ніна – з Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Іх ансамбль, у які ўваходзілі скрыпачы і цымбалісты, выконваў песенныя і танцавальныя традыцыйныя народныя найгрышы. У ансамблі Барысаўскай партызанскай брыгады было таксама нямала народных музыкантаў: скрыпачоў, цымбалістаў, гарманістаў. Усе яны да вайны былі жыхарамі вёскі Бараўляны, якая славілася сваімі музыкантамі. Скрыпач і цымбаліст гэтай вёскі Фёдар Капыткоў арганізаваў у брыгадзе традыцыйны па складу і рэпертуару ансамбль народных інструментаў.

Мастацкая самадзейнасць адпавядала мэтам ідэйна-выхаваўчай работы ў партызанскіх атрадах, садзейнічала ўмацаванню веры ў перамогу над ворагам, падтрымлівала спадзяванні народа на хутчэйшае мірнае жыццё.

Такім чынам, нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы, актыўнае і плённае функцыянаванне музычнай культуры Беларусі не спынілася нават у складаныя ваенныя гады. І хаця формы яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праяўлення часам вельмі адрозніваліся ад тых, што існавалі ў мірны час, тым не менш грамадская патрэбнасць ў музычным мастацтве, якое несла аптымістычнае, светлае светаадчуванне, не знікла. Як і заўсёды, музыка выконвала ў жыцці важныя грамадскія і мастацкія функцыі. Музычнае мастацтва Беларусі ваенных гадоў несла гуманістычныя ідэалы, заставалася высокамастацкім, у поўнай меры нацыянальным, беларускім.

---

1. *История* белорусской музыки: Учеб. пособие/ Общ. ред. Г.Глущенко. – М.: Музыка, 1976. – С. 98–100.

2. *Там жа.*

3. *Цыт.* па: Брылон В. З гісторыі беларускай музычнай культуры:Мікалай Клаус // Проблемы национальных музыкальных культур на рубеже третьего тысячелетия. – Мн.: БелІПК, 1999. – С. 168.

4. *Мухаринская Л.С.* Белорусская народная партизанская песня. 1941–1945. – Мн.: Беларусь, 1968.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ